# Створаны Савет па развіцці лічбавай эканомікі

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28 лютага 2018 г. №167 створаны Савет па развіцці лічбавай эканомікі, які будзе каардынаваць дзейнасць па рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы лічбавай трансфармацыі эканомікі і развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

**Асноўнымі задачамі Савета з'яўляюцца:**

вызначэнне мэтаў і задач лічбавай трансфармацыі нацыянальнай эканомікі; усталяванне прыярытэтаў укаранення лічбавых тэхналогій для вытворчых галін, сфер гандлю і паслуг, сацыяльнай сферы з улікам апошніх дасягненняў у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і развіцця глабальнай лічбавай прасторы; фарміраванне спрыяльнага прававога і рэгулятарнага асяроддзя для развіцця нацыянальнай лічбавай эканомікі; стымуляванне пераходу да перадавых лічбавых тэхналогій у розных сферах эканомікі і грамадскіх адносін; стварэнне і развіццё сучаснай лічбавай інфраструктуры і стварэнне лічбавых платформаў рознага прызначэння; развіццё нацыянальнай індустрыі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій; пытанні эфектыўнасці працы рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых арганізацый у сферы развіцця лічбавай эканомікі; рэалізацыя інвестыцыйных праектаў і праектаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій; міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы лічбавай эканомікі.

Арганізацыйнае і інфармацыйнае забеспячэнне дзейнасці Савета ажыццяўляецца Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі.

**Пастановай таксама зацверджаны склад Савета:**

Кабякоў Андрэй Уладзіміравіч - Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь (Старшыня Савета); Мацюшэўскі Васіль Станіслававіч - Першы намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь (намеснік старшыні Савета); Шэдко Дзмітрый Генадзевіч - першы намеснік Міністра сувязі і інфарматызацыі (сакратар); Алейнікаў Дзяніс Валер'евіч - адвакат, старшы партнёр грамадства з абмежаванай адказнасцю «Алейнікаў і Партнёры»; Гурскі Дзмітрый Анатольевіч - дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Айдиономикс Диджитал»; Добкін Аркадзь Міхайлавіч - старшыня савета дырэктараў кампаніі «ЭПАМ Сістэмз»; Калечыц Дзмітрый Леанідавіч - намеснік Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка; Кандраценка Алег Васільевіч - дырэктар таварыства з абмежаванай адказнасцю «Лайт Вел Организейшн»; Курбацкі Аляксандр Мікалаевіч - старшыня экспертнага Савета Парку высокіх тэхналогій, загадчык кафедры тэхналогій праграмавання факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта; Лукашэнка Віктар Аляксандравіч - памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па нацыянальнай бяспецы; Мякіш Антон Аляксандравіч - дырэктар замежнага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Майкрасофт Софтвер Бел»; Паўлючэнка Андрэй Юр'евіч - начальнік Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь; Папкоў Сяргей Пятровіч - Міністр

сувязі і інфарматызацыі; Снапкоў Мікалай Генадзевіч - Намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; Турчын Аляксандр Генрыхавіч - Кіраўнік Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь; Янчэўскі Усевалад Вячаслававіч - дырэктар дзяржаўнай установы «Адміністрацыя Парку высокіх тэхналогій».

Дакумент уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Па інфармацыі нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь

---

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/12-03-2018-2838*